**Зазерская В. В.** Социальные аспекты развития интеллектуального потенциала в экономике знаний . . . . . . . . . . . . . . 106
**Климук В. В.** Факторы активизации инновационного развития промышленных предприятий в условиях пандемии и в постпандемический период . . . . . . . . . . 113
**Климук В. В., Климук Е. В.** Развитие методики оценки уровня инновационного развития промышленного сектора экономики в стратегии неоиндустриализации . . . . . . . . . . 120
**Курбеко Н. А.** Теоретические аспекты трактовки сущности реального сектора экономики . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
**Лизакова Р. А.** Внедрение принципов маркетинга взаимодействия в бизнес-процессы отечественных предприятий . . . . 133
**Наранович О. И., Горбач Ю. Е., Ермакова А. А.** Разработка имитационной модели решения оптимизационной задачи с учетом ограниченности ресурсов . . . . . . . . . . 138
**Платоненко Е. И., Рутман Е. Я.** Система маркетинга образовательных услуг учреждения образования «Барановичский государственный университет» . . . . . . . . . . 148
**Тозик М. В.** Основные проблемы в деятельности небанковских финансовых организаций в условиях макроэкономической стабилизации в Республике Беларусь (1996—2001) . . . . . . . . . . 154
**Трич Ю. А.** Управление отходами стекла как элемент ресурсосберегающей деятельности . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
**Харкевич И. С.** Использование социологических инструментов для оценки факторов, влияющих на инновационное развитие предприятий Республики Беларусь . . . . . . . . . . 164

### ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ

**Василевич Г. А.** Комплексный подход к противодействию коррупции — залог успеха . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
**Горбатова М. А.** Группа лиц по предварительному сговору: некоторые вопросы теории и практики . . . . . . . . . . . . . 181
**Дзик И. Р.** Система и классификация гражданско-правовых договоров в сфере профессионального спорта . . . . . . . . . 185
**Кирмель А. Г.** Семейно-правовые последствия изменения половой принадлежности лиц, состоящих в браке . . . . . . 190
**Петровский Н. А.** Государственно-управленческий концепт в современных условиях развития Республики Беларусь . . . . . . 194
**Резюк В. И.** Уголовная ответственность за злоупотребление властью или служебными полномочиями, совершенное должностным лицом при разгосударствлении, приватизации государственной собственности: становление и развитие, особенности современного состояния . . . . . . . . . . 198
**Рузанова В. Д.** Проблемы формирования информационного законодательства в аспекте теории систем . . . . . . . . . . . 204
**Рутман Е. Я.** Правовой статус несовершеннолетнего: некоторые межотраслевые аспекты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
**Скок О. И., Шуленкова И. В.** Уголовно-правовая трактовка особой жестокости в составе убийства . . . . . . . . . . . . . 215
**Соловьёв П. В.** Реализация принципа конституционности на стадиях планирования нормотворческой деятельности и нормотворческой инициативы . . . . . . . . . . 219

Репозиторий БарГУ

## ЗМЕСТ

### ГІСТАРЫЧНЫЯ НАВУКІ

**Булаты П. Ю.** Адносіны Хадкевічаў і шляхціца Свядэрскага ў справе заставы двара Паўлюкоўшчына (1590) . . . . . . 13
**Ганчар А. І.** Рэфармаванне рымска-каталіцкіх духоўных кансісторый у Расійскай імперыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
**Калтачэнка А. І.** Метадалагічныя аспекты вывучэння адукацыйных падарожжаў XVI—XVIII стагоддзяў на прыкладзе адукацыі Якуба Сабескага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
**Канцавы П. А.** Некаторыя асаблівасці дэмантажных мерапрыемстваў у савецкай зоне акупацыі Германіі і Аўстрыі (1945—1948) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
**Котусеў Я. М.** Праблематыка адносін германскага свету і славянства ў XIII—XVI стагоддзях ў творчасці М. М. Любовіча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
**Крывуць В. І.** Марш «Свіцязянскі шлях»: з гісторыі развіцця спорту ў Баранавіцкім павеце ў міжваенны перыяд . . . 50
Кручкоўскі Т. Т., Котусеў Я. М. Асноўная праблематыка расійскай палітыкі ў Цэнтральнай Еўропе ў першай трэці XIX стагоддзя ў ацэнцы рускай гістарычнай навукі другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя (на прыкладзе Герцагства Варшаўскага і Царства Польскага) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
**Лішык У. В.** Дзейнасць роду Урсын-Нямцэвічаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII стагоддзя . . . . . . . . . 71
**Скорб М. Г.** Расійская і аўстрыйская мадэлі аўтанамізацыі бялградскага пашалыка на пачатковым этапе Першага сербскага паўстання (1804—1806) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
**Спірыдонава Т. А.** Дзеянні ўпаўнаважаных Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы пры Савеце Міністраў БССР у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 16 сакавіка 1961 года (1961—1965) . . . . . . . . . . . . . . 82
**Стурэйка М. А.** Роля дзяржаўных святаў у фарміраванні грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь . . . . . . . 88

### ЭКАНАМІЧНЫЯ НАВУКІ

**Куньпэн Х.** Інстытуцыйныя рамкі і план актыўнага ўдзелу Кітая ў дзейнасці Сусветнай арганізацыі аховы здароўя . . . . 94
**Бязуглая В. А., Касцюкевіч А. А.** Кампетэнтнасная мадэль адукацыі 3.0: сусветны і айчынны вопыт . . . . . . . . . . . . . 101
**Зазерская В. В.** Сацыяльныя аспекты развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу ў эканоміцы ведаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
**Клімук У. У.** Фактары актывізацыі інавацыйнага развіцця прамысловых прадпрыемстваў ва ўмовах пандэміі і ў постпандэмічны перыяд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
**Клімук У. У., Клімук Я. В.** Развіццё методыкі ацэнкі ўзроўню інавацыйнага развіцця прамысловага сектара эканомікі ў стратэгіі неаіндустрыялізацыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
**Курбека Н. А.** Тэарэтычныя аспекты трактоўкі сутнасці рэальнага сектара эканомікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
**Лізакова Р. А.** Укараненне прынцыпаў маркетынгу ўзаемадзеяння ў бізнес-працэсы айчынных прадпрыемстваў . . . 133
**Нарановіч А. І., Горбач Ю. Я., Ермакова Г. А.** Распрацоўка імітацыйнай мадэлі рашэння аптымізацыйнай задачы з улікам абмежаванасці рэсурсаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
**Платоненка А. І., Рутман А. Я.** Сістэма маркетынгу адукацыйных паслуг установы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
**Тозік М. В.** Асноўныя праблемы ў дзейнасці нябанкаўскіх фінансавых арганізацый ва ўмовах макраэканамічнай стабілізацыі (1996—2001) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
**Трыч Ю. А.** Упраўленне адходамі шкла як элемент рэсурсазберагальнай дзейнасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
**Харкевіч І. С.** Выкарыстанне сацыялагічных інструментаў для ацэнкі фактараў, якія ўплываюць на інавацыйнае развіццё Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 164

### ЮРЫДЫЧНЫЯ НАВУКІ

**Васілевіч Г. А.** Комплексны падыход да процідзеяння карупцыі — залог поспеху . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
**Гарбатава М. А.** Група асоб па папярэдняй змове: некаторыя пытанні тэорыі і практыкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181
**Дзік І. Р.** Сістэма і класіфікацыя грамадзянска-прававых дагавораў у сферы прафесійнага спорту . . . . . . . . . . . . . . . . 185
**Кірмель А. Г.** Сямейна-прававыя наступствы змены палавой прыналежнасці асоб, якія знаходзяцца ў шлюбе . . . . . . 190
**Пятроўскі М. А.** Дзяржаўна-кіраўнічы канцэпт у сучасных умовах развіцця Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . 194
**Рэзюк В. І.** Крымінальная адказнасць за злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі, здзейсненае службовай асобай пры раздзяржаўленні, прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці: станаўленне і развіццё, асаблівасці сучаснага стану . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 198
**Рузанава В. Д.** Праблемы фарміравання інфармацыйнага заканадаўства ў аспекце тэорыі сістэм . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
**Рутман А. Я.** Прававы статус непаўналетняга: некаторыя міжгаліновыя аспекты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
**Скок А. І., Шулянкова І. В.** Крымінальна-прававая трактоўка асаблівай жорсткасці ў складзе забойства . . . . . . . . . . 215
**Салаўёў П. В.** Рэалізацыя прынцыпу канстытуцыйнасці на стадыях планавання нарматворчай дзейнасці і нарматворчай ініцыятывы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 219

Репозиторий БарГУ

## CONTENTS

### HISTORICAL SCIENCES AND ARCHAEOLOGY


**Bulaty P. Yu.** The relations between the Hadkievičs and the nobleman Sviaderski in the case of the leasing of Paŭliukoŭščyna estate (1590) . . . 13

**Hanchar A. I.** Reformation of Roman catholic ecclesiastical consistories in the Russian empire . . . 18

**Kaltachenka A. I.** Methodological aspects of the study of educational travel XVI—XVIII centuries on the example of the education of Jakub Sobieski . . . 27

**Kantsavoi P. A.** Some features of dismantling measures in the soviet zone of occupation of Germany and Austria (1945—1948) . . . 32

**Kotusev E. N.** The problematics of the relations of the german peace and the slavery in the XIII—XVI centuries in the works of N. N. Lyubovich . . . 37

**Krivut V. I.** March “Svityazyanskiy shlyakh”: from the history of sport development in the Baranovichi region in the interwar period . . . 50

**Kruchkovsky T. T., Kotusev E. N.** The main problems of russia’s policy in Central Europe in the first third of the XIX century in the assessment of russian historical science in the second half of the XIX — early XX century (on the example of the Duchy of Warsaw and the Kingdom of Poland) . . . 55

**Lishyk V. V.** The family of Ursyn-Nemtsevich in the territory of Belarus in the second half of the XVIII century . . . 71

**Skorb M. G.** Russian and Austrian models of autonomy of the pashalik of Belgrade at the initial stage of the First serbian uprising (1804—1806) . . . 77

**Spiridonova T. A.** Actions of the commissioners of the Council for the affairs of Russian orthodox church under the Council of Ministers the BSSR in accordance with the resolution of the Council of Ministers of the USSR of march 16, 1961 (1961—1965) . . . 82

**Stureiko N. A.** The role of public holidays in the formation of civil society in the Republic of Belarus . . . 88


### ECONOMICS


**Kunpeng H.** Institutional framework and plan for China’s active participation in the activities of the world health organization . . . 94

**Bezuglaya V. A., Kostyukevich E. A.** Competence education model 3.0: world and domestic experience . . . 101

**Zazerskaya V. V.** social aspects of intellectual potential development in the knowledge economy . . . 106

**Klimuk V. V.** Redictors of effective collaboration of the educational, scientific and business sectors in terms of digital economy . . . 113

**Klimuk V. V., Klimuk E. V.** Development of the methodology for assessing the level of innovative development of the industrial sector of the economy in the strategy of neo-industrialization . . . 120

**Kurbeka N. A.** Theoretical aspects of the interpretation of the essence of the real sector of the economy . . . 128

**Lizakova R. A.** Implementation of interaction marketing principles in the business processes of domestic enterprises . . . 133

**Naranovich O. I., Gorbach Y. E., Ermakova A. A.** Development of a simulation model for the solution of an optimization problem taking into account the restriction of resources . . . 138

**Platonenko E. I., Rutman E. Y.** Marketing system for educational services in the educational institution “Baranovichi State University” . . . 148

**Tozik M. V.** The main problems in the activities of non-bank financial institutions in the context of macroeconomic stabilization in Belarus (1996—2001) . . . 154

**Trych Yu. A.** Glass waste management as an element of resource-saving activities . . . 159

**Kharkevich I. S.** Use of sociological instruments for the estimation of factors, influencing innovative development of the enterprises of the Republic of Belarus . . . 164


### LAW


**Vasilevich G. A.** An integrated approach to anti-corruption — a success for success . . . 170

**Gorbatova M. A.** A group of persons by prior collusion: some issues of theory and practice . . . 181

**Dzik I. R.** System and classification of civil contracts in the field of professional sports . . . 185

**Kirmel A. G.** Family and legal consequences of changing the gender of married persons . . . 190

**Piatrouski N. A.** State management concept in modern conditions of the development of the Republic of Belarus . . . 194

**Rezyuk V. I.** Criminal liability for the abuse of power or official authority committed by an official during the denationalization and privatization of state property: formation, development, features of the current state . . . 198

**Ruzanova V. D.** Problems of the formation of the information legislation in the aspect of the systems theory . . . 204

**Rutman E. Y.** Legal status of a juvenile: some cross-sectoral aspects . . . 209

**Skok O. I., Shulenkova I. V.** Criminal law interpretation of special cruelty in murder . . . 215

**Soloviev P. V.** Implementation of the principle of constitutionality at the stages of planning rule-making activity and rule-making initiative . . . 219


Репозиторий БарГУ

УДК 94(476)"15"

**П. Ю. Булаты**
Інстытут менеджменту спорту і турызму ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізкультуры»,
Міністэрства спорту і турызму, пр. Пераможцаў, 105, 220020 Мінск, Рэспубліка Беларусь,
+375 (29) 576 03 86, pawelbulaty@gmail.com

# АДНОСІНЫ ХАДКЕВІЧАЎ І ШЛЯХЦІЦА СВЯДЭРСКАГА Ў СПРАВЕ ЗАСТАВЫ ДВАРА ПАЎЛЮКОЎШЧЫНА (1590)

Артыкул прысвечаны разгляду маёмаснай справы, якая мела месца паміж прадстаўнікамі магнатэрыі графамі Аляксандрам і Янам Каралям Хадкевічамі і шляхціцам С. Свядэрскім. Прадмет справы — дамова аб перадачы ў трыманне двара Паўлюкоўшчына, які ўваходзіў у склад буйнога магнацкага маёнтка Ляхавіцкае графства. Увага надаецца ўмовам, на якіх Свядэрскі трымаў маёнтак у заставе, а таксама акалічнасцям яго перадачы ва ўладанне шляхціца. У артыкуле прыводзіцца падрабязнае апісанне двара Паўлюкоўшчына і вёсак, якія ўваходзілі ў яго склад, акрэсліваюцца яго межы, згадваецца мясцовая тапаніміка. На падставе дакументаў з фондаў Архіва Патоцкіх у навуковы зварот уводзяцца новыя звесткі аб уладаннях Хадкевічаў, іх узаемаадносінах з павятовай шляхтай у рэчышчы кліентарна-патранальных стасункаў.

**Ключавыя словы:** магнатэрыя; шляхта; застава; Хадкевічы; кліентарна-патранальныя адносіны; Ляхавіцкае графства.
Мал. 1. Бібліягр.: 10 назваў.

**P. Yu. Bulaty**
Institute of Sports and Tourism Management of the Belarusian State University of Physical Culture,
Ministry of Sport and Tourism, 105 Pieramožcaŭ Ave., 220020 Minsk, Republic of Belarus,
+375 (29) 576 03 86, pawelbulaty@gmail.com

# THE RELATIONS BETWEEN THE HADKIEVIČS AND THE NOBLEMAN SVIADERSKI IN THE CASE OF THE LEASING OF PAŬLIUKOŬŠČYNA ESTATE (1590)

The article is devoted to the consideration of the property case, which took place between the representatives of the magnate counts Alexander and Jan Karol Hadkievič and the nobleman S. Swiaderski. The subject of the case is an agreement on the transfer of the Paŭliukoŭščyna manor, which was a part of a large magnate's estate in Lachavičy county. Attention is paid to the conditions under which Swiaderski kept the estate in pledge, as well as the circumstances of its transfer to the possession of the nobleman. The article provides a detailed description of the Paŭliukoŭščyna estate and the villages that were part of it, outlines its boundaries, and mentions local names. Based on documents from the funds of the Patotski Archive, new information about the Hadkievič estates and their relations with the county nobility in the field of client-patronage relations introduced into the scientific appeal.

**Key words:** magnate; gentry; rent; Hadkievič; client-patronage relations; Lachavičy county.
Fig. 1. Ref.: 10 titles.

**Уводзіны.** У Вялікім княстве Літоўскім існавала такая форма маёмасных узаемаадносін паміж прадстаўнікамі магнатэрыі і шляхты, як «уладар-трымальнік». У сістэме гэтых адносін распаўсюджаней іх формай, пры якой маёмасць перадавалася ад уладара іншым асобам (трымальнікам), называлася заставай. Трымальнікі — шляхціцы, якія пазычалі наяўныя грошы ўладару пад заставу яго зямель (двароў). Пры перадачы маёмасці ў заставу да крэдытора звычайна пераходзілі ўсе правы на землеўладанне і перададзеных яму разам з маёмасцю людзей. Для ўладара маёнтка застава была істотнай крыніцай даходу, для крэдытора — перспектыва набыцця зямель, якія ён трымаў у заставе. Апроч прыбытковага складніку ў заставе меўся складнік узаемавыгадных сацыяльных адносін паміж уладаром і трымальнікам. Як адзначае гісторык А. Радаман, гэтак званыя «крэдытары», якія пазычалі наяўныя грошы пад заруку зямель, уваходзілі ў блізкае кола кліентэлы магната [1]. Даследчык У. Падалінскі адзначае,

© Булаты П. Ю., 2020



Репозиторий БарГУ

што аказваючы паслугі па крэдытаванні патронаў (сярод іншых паслуг трэба адзначыць вайсковую службу, дзейнасць на сойміках і соймах, прадстаўленне інтарэсаў у судах і г. д., якія шчыльна перапляталіся паміж сабой), кліенты, апроч атрымання грошаў, маглі разлічваць на забеспячэнне пасадамі і землямі, атрыманне адукацыі і выхаванне пры магнацкім двары [2].

**Матэрыялы і метады даследавання.** Прыкладам узаемаадносін узроўню «ўладар-трымальнік» з'яўляюцца адносіны, якія мелі месца паміж прадстаўнікамі магнатэрыі Аляксандрам Хадкевічам (пам. 1624; граф, ваявода троцкі), яго братам Янам Каралем Хадкевічам (1560—1621; граф, вялікі гетман літоўскі, ваявода віленскі) з аднаго боку і шляхціцам Сымонам Свядэрскім з іншага. Акалічнасці справы аб заставе апісаныя ў дакуменце пад загалоўкам "Akta dotyczące zastawu dóbr pawlikowskich z klucza Lackowicze przez Chodkiewiczów i oddania ich na własność za wierną służbę Szymonowi Świderskiemu" [3, арк. 5—7]. Адзначаны дакумент захоўваецца ў фондах Архіва Патоцкіх з Радзына (фонд № 334, Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie). Гэты акт быў складзены 9 лістапада 1590 года на пасяджэнні гродскага суда ў Слоніме, куды былі пададзены лісты ад братоў Хадкевічаў (датуюцца 8 кастрычніка 1590 года) для занясення ў актавыя кнігі. З самім дакументам у архіўнай установе магчыма пазнаёміцца толькі ў фармаце мікрафільму.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстоўваліся агульнанавуковыя і спецыяльныя гістарычныя метады даследавання.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Фармальныя адносіны паміж братамі Хадкевічамі і шляхціцам Свядэрскім у межах ляхавіцкага маёнтка ўзніклі ў 1589 годзе, але дзеля бачання поўнай карціны акрэсленых узаемаадносін адзначым вяхі падзей, якія папярэднічалі гэтаму.

Род Хадкевічаў у асобе Яна Геранімa Хадкевіча (1537—1579; маршалак вялікі) пачаў валодаць ляхавіцкім маёнткам ад 10 красавіка 1572 года, калі ў Варшаве падчас вольнага сойма быў афармлены дагавор з вялікім князем Жыгімонтам Аўгустам на абмен яго маёнтка Ляхавічы на маёнтак Свіслач з уладання Хадкевіча. Аднак канчаткова ўступіць ва ўладанне ляхавіцкім маёнткам Хадкевіч змог толькі ў 1576 годзе, што звязана было з нявырашанасцю рознагалосся з былым ляхавіцкім дзяржаўцам Уладзімірам Забалоцкім, які меў дамаганні адносна ляхавіцкіх уладанняў. Так, з 1576 года род Хадкевічаў ужо бесперашкодна валодаў ляхавіцкім маёнткам. Пасля смерці Я. Г. Хадкевіча ў 1579 годзе яго маёнткамі сумесна распараджаліся сыны Аляксандр і Ян Караль. Паміж сабой яны раздзялілі бацькоўскую спадчыну толькі ў 1592 годзе, саставіўшы 18 мая адпаведны акт падзелу зямель [4, с. 73]. Аднак ляхавіцкім маёнткам да сваёй смерці ў 1588 годзе распараджалася ўдава Яна Геранімa Крысціна са Збароўскіх [5].

Прадметам узаемаадносін братоў Хадкевічаў і Свядэрскага з'яўляліся правы на ўладанне дваром Паўлюкоўшчына, які ўваходзіў у склад ляхавіцкага маёнтка. Упершыню на старонках справаводства Вялікага княства Літоўскага Паўлюкоўшчына адзначаецца яшчэ ў 1520 годзе, калі, набыўшы ў баярына Наваградскага павета В. Паўлюковіча як «землю Павликовщину», яе да ляхавіцкага маёнтка далучыў Альбрэхт Гаштольд (пам. 1539 г.; вялікі канцлер літоўскі) [6, с. 68]. У сваім ляхавіцкім маёнтку ў 1535 годзе Гаштольд фундаваў каталіцкі касцёл, вылучыўшы на яго ўтрыманне двор Паўлюкоўшчына (налічвалася 8 дымоў [7, с. 102—105]) [8, арк. 195—200]. Аднак праз некалькі дзесяцігоддзяў гэты двор ужо не знаходзіўся ва ўладанні мясцовай парафіі, ім распараджаўся ўладар ляхавіцкага маёнтка. Так, у перыяд паміж 1576 і 1579 гадамі Ян Геранім Хадкевіч пад заставу ў 500 коп грошай перадаў «фолварк ляховицкий Павлюковский» шляхціцу Мацвею Воўку [5]. Пасля смерці Хадкевіча яго ўдава Крысціна ў 1584 годзе мела непаразуменні і судовыя разбіральніцтвы з панам Воўкам. Звяртае на гэта ўвагу мемуарыст Фёдар Еўлашоўскі (1546—1616; падсудак наваградскага земскага суда), які знаходзіўся на службе Хадкевічаў. Ён адзначае, што Воўк падрабіў дакументы, зрабіўшы сабе яшчэ адзін заставы ліст Хадкевіча на суму ў 500 коп грошай [5]. Вынікала, што ўдава Хадкевіча была павінна выплаціць Воўку суму ў 1 000 коп грошай. Па словах Еўлашоўскага, удава на прадмет падробкі дакументаў і змены сумы заставы вяла судовыя працэсы ў земскім і гродскім судах. У выніку судовых спраў Воўк ад складзенага ім ліста на дадатковую суму ў 500 коп адступіў [5]. Трэба меркаваць, што пасля гэтага разбіральніцтва браты Хадкевічы вырашылі спыніць адносіны з Воўкам і перадаць Паўлюкоўшчыну іншаму трымальніку — Сымону Свядэрскаму.

Вывучыўшы змест маёмаснага акта, які быў складзены ў гродскім судзе Слоніма ў 1590 годзе, адзначым, што тыя звесткі, якія ў ім утрымліваюцца, можна размеркаваць на тры асноўныя інфарматыўныя рубрыкі: 1) звесткі аб Сымоне Свядэрскім; 2) умовы і абставіны перадачы маёнтка; 3) апісанне межаў маёнтка.

Рэпазіторый БарДУ

*Асоба трымальніка*. Сымон Свядэрскі — прадстаўнік земскай шляхты. Гэта група падпарадкаванага ўладару маёнтка ваеннаслужылага насельніцтва, якая жыла на тэрыторыі ляхавіцкага маёнтка і мела надзел зямлі. Першапачаткова С. Свядэрскі (хутчэй за ўсё са згоды ўладара ляхавіцкага маёнтка) распараджаўся пэўнай маёмасцю (дакладныя звесткі ў акце не акрэсліваюцца) на ўмовах выканання вайсковай службы ў шляхецкім апалчэнні, знаходзячыся ў васальнай залежнасці ад уладара маёнтка.

У сярэдзіне XVI стагоддзя мела месца патрабаванне ляхавіцкай земскай шляхты пераводу яе пад «земскае права» Наваградскага павета. Абумоўлена гэта было тым, што прававое становішча баяраў-шляхты, якія жылі ў прыватных і княжацкіх маёнтках, было значна горшым, чым так званай павятовай шляхты [9]. Назіралася агульная тэндэнцыя: ужо з сярэдзіны XVI стагоддзя на соймах Вялікага княства Літоўскага ўсё часцей падымалася пытанне аб ураўнаванні шляхты ў правах. Але захады ляхавіцкай шляхты былі беспаспяховыя. Так, выдадзены вялікім князем Жыгімонтам Аўгустам загад ад 5 лютага 1567 года падкрэсліваў, што ляхавіцкія баяры-шляхта не падлягаюць юрысдыкцыі павятовых судоў без спецыяльнага яго дазволу [10, арк. 94]. Тым не менш некаторым шляхціцам у перыяд 1560-х удалося атрымаць прывілеі на выхад пад прысуд Наваградскага павета [4, с. 66], але ў той жа час частка васальнай шляхты ляхавіцкага маёнтка не здолела дамагчыся вызвалення ад вотчыннай юрысдыкцыі Жыгімонта Аўгуста і ў выніку абмену ў 1572 годзе апынулася ў васальнай залежнасці ад Яна Гераніма Хадкевіча.

У шэрагах ляхавіцкай земскай шляхты знаходзіўся і С. Свядэрскі. Са звестак, прадстаўленых у акце 1590 года, можна прасачыць асноўныя моманты яго службы. Адзначаецца, што Свядэрскі знаходзіўся на службе ў Хадкевічаў з маладых сваіх гадоў [3]. Адсюль вынікае, што на момант складання дакумента шляхціц быў ужо ў досыць сталым узросце. Спачатку ён служыў у Яна Гераніма Хадкевіча. У перыяд з 1579 па 1588 год знаходзіўся на службе ў яго ўдавы Крысціны, а затым, урэшце, верна служыў братам Аляксандру і Яну Каралю Хадкевічам [3]. Аднак у дакуменце няма звестак аб кар'еры шляхціца. Застаецца невядомым, на якой службе ён знаходзіўся, якія функцыі пры двары Хадкевічаў выконваў. Разам з перадачай Свядэрскаму маёмасці змяніўся яго сацыяльны статус. Так, пасля зацвярджэння акта браты Хадкевічы «выпускалі» шляхціца пад прысуд Наваградскага павету, што азначала вызваленне яго ад васальнай залежнасці [3].

*Умовы і абставіны перадачы маёнтка.* Галоўным прадметам складзенага акта з'яўляўся працэс перадачы ва ўладанне С. Свядэрскага. Гэта перадача суправаджалася шэрагам акалічнасцей і ўмоў.

У акце 1590 года адзначаецца, што С. Свядэрскі ў 1589 годзе маёнтак Паўлюкоўшчыну выкупіў у Мацвея Воўка і яго жонкі Падарэўскай. Пад выкупам трэба разумець, што Свядэрскі ўнёс Воўку суму, на якую быў застаўлены маёнтак (500 коп грошаў) [3]. Так, пазыка, пад якую быў застаўлены двор, была пагашаная, Хадкевічы маглі перадаць маёнтак у заставу іншаму трымальніку на зусім іншых умовах. Па рашэнні Аляксандра Хадкевіча (ва ўсіх месцах згадваюцца два браты, у гэтым — толькі Аляксандр) двор Паўлюкоўшчына быў перададзены ў заставу С. Свядэрскаму пад суму 1 000 коп грошаў (трэба меркаваць, з улікам выплаты Воўку). Далей адзначаецца, што браты Хадкевічы вырашаюць не выкупаць (не вяртаць 1 000 коп грошай) Паўлюкоўшчыну ў Свядэрскага, а перадаць гэты двор яму за службу на вечныя часы [3]. На нашу думку, адзначаны працэс — пагашэнне Свядэрскім пазыкі Хадкевічаў і далейшая перадача яму двара — быў загадзя абгавораны, гэтыя дамоўленасці мелі месца паміж магнатамі і шляхціцам. Тут прасочваецца імкненне Свядэрскага займець уласны маёнтак (характэрнае для прадстаўніка земскай шляхты), а папярэдні канфлікт Хадкевічаў з Воўкам стварыў спрыяльныя для Свядэрскага ўмовы, каб гэта здзейсніць.

У дакуменце акрэслівалася, што перададзеным маёнткам Свядэрскі мог свабодна распараджацца па сваім жаданні: прадаць яго, аддаць, падарыць, перадаць у заставу, замяніць, запісаць на касцёл. Пры тым Хадкевічы гарантавалі шляхціцу акрэсленую свабоду дзейнасці, выдаўшы як са свайго боку, так і з боку сваіх нашчадкаў заруку. Адзначалася, што ў выпадку дзеянняў Хадкевічаў (ці іх нашчадкаў) у адносінах да маёмасці Свядэрскага, якая б шкодзіла маёмасці ці парушала правы шляхціца свабодна ёю распараджацца, яны мусяць заплаціць таму суму памерам 3 000 коп грошаў літоўскіх [3].

*Апісанне маёнтка.* Аб'ектам акта 1590 года з'яўляецца маёмасць, якая перадавалася Хадкевічамі шляхціцу Свядэрскаму. Перададзеная маёмасць, яе склад і межы падрабязна апісваюцца ў дакуменце. Адзначым, што ўсе тыя землі, якія пераходзілі ва ўладанне шляхціца, уваходзілі ў склад ляхавіцкага маёнтка. Пры гэтым у дакуменце падаецца цікавая акалічнасць («гісторыя» маёнтка): зафіксавана, што маёнтак перайшоў айцу Аляксандра і Яна Караля Хадкевічаў ад вялікага князя Жыгімонта Аўгуста [3]. Таксама паведамляецца, што межы перададзенага двара і вёсак былі вымераны рэвізорамі Дзмітрыем Са-

Репозиторий БарГУ

пегам і Вацлавам Сутынскім як раз у часы, калі ляхавіцкім маёнткам уладарыў Жыгімонт Аўгуст. Па гэтых замерах, здзейсненых у 1560-я [4, с. 67], вызначаўся памер зямлі ў валоках, які перадаваўся Свядэрскаму.

Са складзенага акта вынікае, што браты Хадкевічы перадавалі ў вечнае карыстанне двор Паўлюкоўшчына, сяло Паўлюкоўшчына і сяло Русінавічы, каб, як адзначаецца ў дакуменце, Свядэрскі ў маёнтку карыстаўся пажыткамі і паспяхова іх памнажаў. У дакуменце адзначаюцца памеры кожнай часткі, перададзенай шляхціцу: 1) пры двары Паўлюкоўшчына мелася 13 валок і 20 моргаў зямлі; 2) да сяла Паўлюкоўшчына было дапасавана аселых і пустых 18 валок; 3) да другога сяла — Русінавічы — належала 33 валокі зямлі [3].

Вышэй акрэслена маёмасць, якая раней знаходзілася ў заставе шляхціца М. Воўка і пасля працэдуры пагашэння пазыкі братоў Хадкевічаў перадавалася С. Свядэрскаму. Па «сваёй добрай волі» [3] Хадкевічы дадалі да гэтых зямель дадатковы надзел (яго замеру праводзіў мернік Хадкевічаў Пётр Забэла), які падрабязна апісваецца ў акце 1590 года.

Так, Свядэрскаму перадавалася ва ўладанне гэтак званая «чаркасаўская» зямля памерам у 4 валокі 27 моргаў, якую першапачаткова трымаў ляхавіцкі земянін Андрэй Чаркас. Хадкевічы замянілі яму надзел на іншы, а адзначаныя валокі далучылі да двара Свядэрскага. Далучаныя землі знаходзіліся як раз паміж сёламі Паўлюкоўшчына і Русінавічы. Апісваюцца межы гэтага надзела: з аднаго боку надзел мяжуе з Замкавым Борам і з маёнткам ляхавіцкіх зямян Мазуркоў (іх сялом Ганчары); па другі бок землі сягаюць да броду Баравога пры сяле Русінавічы; з трэцяга боку надзел даходзіць да канцавой сценкі (трэба меркаваць, да межаў ляхавіцкага маёнтка); з чацвёртага боку зямля ўпіраецца ў зямлю двара Паўлюкоўшчына [3].

Да гэтых жа зямель мернікам Забэлам было дададзена 18 моргаў і 60½ прутаў зямлі.

Акрамя таго, Свядэрскаму перадавалася 12 валок зямлі ляхавіцкіх зямян Грыцковічаў. У дакуменце адзначаецца, што першапачаткова гэтыя валокі знаходзіліся ў трыманні зямян Міхны, Ваські, Фёдара і Сцяпана Грыковічаў, а таксама шляхціцаў Валадоцкага і Галаўні. Пазней усе гэтыя землі былі перададзеныя ў трыманне службоўцу Хадкевічаў Івану Крэчэтаўскаму. З дазволу Хадкевічаў Крэчэтаўскі саступіў землі Свядэрскаму (гэта працэдура была завераная асобным лістом Крэчэўскага, спасылка на які маецца ў акце 1590 года) [3].

Такім чынам, шляхціцу Свядэрскаму перадавалася: двор, 2 сяла і зямля, агульны памер якой складаў 88 валок 5 моргаў і 60½ пруты (схема маёнтка прадстаўлена на малюнку 1). Зямля перадавалася, як адзначаецца ў дакуменце, з селішчамі, засценкамі, людзьмі і рознымі пажыткамі. Для параўнання адзначым, што памер ляхавіцкага маёнтка па стане на 1560-я складаў 363 валокі 1 морг 18 прутаў [4, с. 67]. Выведзеныя з яго складу 88 валок — істотны зямельны надзел.




**Малюнак 1. — Схема маёнтка шляхціца С. Свядэрскага (1590)**

*Заўвага.* Умоўная мадэль, складзеная аўтарам.



Репозиторий БарГУ

У дакуменце, які намі разглядаецца, цікавасць уяўляюць таксама звесткі, якія змяшчаюцца ў канцы ліста, дасланага Хадкевічамі ў Слонім. З гэтай часткі акта становіцца вядома, што ліст на перадачу маёмасці быў складзены ў Ляхавічах, пры гэтым прысутнічаў асабіста Сымон Свядэрскі. Ліст быў уласнаручна падпісаны братамі Аляксандрам і Янам Каралем Хадкевічамі і завераны пячаткамі. Пры напісанні ліста прысутнічалі сведкі, якія таксама ўласнаручна яго падпісалі і прыціснулі пячаці. Сведкамі з'яўляліся: прадстаўнікі земскай шляхты Марцін Скрашынскі, Беняш Чарноўскі, Фёдар Еўлашоўскі, Крыштаф Гзоўскі, Ян Магільніцкі, возны навагрудскага павету Андрэй Елаза [3].

**Заключэнне.** Разгледзеўшы маёмасную справу, якая мела месца паміж прадстаўнікамі магнатэрыі графамі Аляксандрам і Янам Каралям Хадкевічамі і шляхціцам С. Свядэрскім у 1590 годзе, можна абагульніць яе асноўныя моманты і адзначыць акалічнасці.

Падзеі, апісаныя ў даследаваным дакуменце, адбываліся ў межах ляхавіцкага маёнтка, якім з 1576 года валодаў род Хадкевічаў. Як вынікае, на момант перадачы двара Паўлюкоўшчына ляхавіцкім маёнткам сумесна валодалі браты Аляксандр і Ян Караль Хадкевічы.

Сымон Свядэрскі — тыповы прадстаўнік земскай шляхты, які распараджаўся пэўнай маёмасцю на ўмовах выканання службы ў Хадкевічаў. Служыў (род службы не вызначаны) Яну Гераніму, яго ўдаве Крысціне, братам Аляксандру і Яну Каралю Хадкевічам. Пасля зацвярджэння акта перадачы маёмасці вызваляўся пад прысуд Наваградскага павету, што азначала вызваленне яго ад васальнай залежнасці перад Хадкевічамі.

Каб атрымаць маёнтак, С. Свядэрскі мусіў шляхціцу М. Воўку ўнесці суму, на якую Хадкевічамі быў застаўлены маёнтак (500 коп грошаў). Спрыяў перадачы маёнтка канфлікт, які меў месца паміж Воўкам і Хадкевічамі (судовая цяжба). Пасля перадачы маёнтка Свядэрскаму Хадкевічы гарантавалі шляхціцу недатыкальнасць яго маёнтка і свабоду дзейнасці, выдаўшы заруку на 3 000 коп грошаў літоўскіх.

Шляхціцу Свядэрскаму перадаваўся маёнтак істотных памераў: двор, 2 сяла і зямля, агульны памер якой складаў 88 валок 5 моргаў і 60½ пруты.

Разгледжаная справа — прыклад таго, як за мнагалетнюю адданую службу шляхціц здолеў атрымаць ад магнатаў права валодаць сваім маёнткам, выйшаўшы з васальнай залежнасці.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Радаман, А.* Патранальна-кліентальныя адносіны ў Новагародскім павеце і іх уплыў на палітыку і дзейнасць органаў шляхецкага самакіравання ў другой палове XVI — пачатку XVII ст. / А. Радаман // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV—XVIII ст.) : зб. навук. прац / рэдкал.: А. М. Янушкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2014. — С. 252—294.

2. *Падалінскі, У. А.* Тэстамент троцкага ваяводы Яна Глябовіча (1590 г.) як крыніца па вывучэнню кліентальных адносін у Вялікім княстве Літоўскім / У. А. Падалінскі // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV—XVIII ст.) : зб. навук. прац / рэдкал.: А. М. Янушкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2014. — С. 158—171.

3. Archiwum Główne Akt Dawnych. — Z. 334. — S. 401.

4. *Булаты, П. Ю.* Ляхавіцкае графства ў сістэме магнацкіх уладанняў (XVI—XVIII ст.) / П. Ю. Булаты. — Мінск : БДУФК, 2020. — 217 с.

5. *Свяжынскі, У. М.* «Гістарычныя запіскі» Фёдара Еўлашоўскага / У. М. Свяжынскі. — Мінск : Навука і тэхніка, 1990. — 121 с.

6. Lithuanian Metrica. Літоўская Метрыка. Lietuvos Metrika. — Vilnius : Mokslo ir enciklopediju leidybos institutas, 1997. — Kn. Nr. 10 (1440—1523). — 179 p.

7. *Ochmański, J.* Biskupstwo Wileńskie w średniowieczu / J. Ochmański. — Poznań, 1972. — 118 s.

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Ф. 1738. Воп. 1. Спр. 1.

9. *Спірыдонаў, М. Ф.* З сівой даўніны / М. Ф. Спірыдонаў // Памяць : гіст.-дакумент. хроніка Ляхав. р-на. — Мінск : БелСЭ, 1989. — С. 29—42.

10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Калекцыя мікрафільмаў 18. Воп. 1. Спр. 266.

Паступіў у рэдакцыю 15.06.2020

Рэпазіторый БарДУ